# ПЁТР ЗАХАРАВІЧ ХОМІЧ
(28.06.1937–22.09.2022)



22 верасня 2022 г. пайшоў з жыцця Пётр Захаравіч Хоміч – адзін з лідараў беларускай геалогіі, выдатны арганізатар геолагаразведачнай вытворчасці, былы намеснік генеральнага дырэктара і галоўны геолаг РУП «Белгеалогія», член-карэспандэнт Беларускай інжынернай акадэміі.

Ён нарадзіўся 28 чэрвеня 1937 г. у с. Старыкі Гарохаўскага раёна Валынскай вобласці (Украіна).

Пётр Захаравіч скончыў геалагічны факультэт Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Івана Франко па спецыяльнасці «разведка радовішчаў карысных выкапняў» і шэсць гадоў пасля вучобы працаваў у геалагічных арганізацыях Сярэдняй Азіі і Сібіры на пасадах геолага, начальніка атрада, начальніка палявых геолага-пошукавых партый.

41 год П.З. Хоміч працаваў у Беларусі, дзе прайшоў шлях ад радавога геолага да намесніка генеральнага дырэктара РУП «Белгеалогія» – аднаго з кіраўнікоў геалагічнай службы Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы прыроджанаму таленту кіраўніка ён 38 гадоў займаў кіруючыя пасады.

Пётр Захаравіч унёс велізарны ўклад у развіццё геолагаразведачнай галіны і мінеральна-сыравіннай базы Беларусі.

За гады працы пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле выканана даразведка ўнікальнага Старобінскага радовішча калійных солей; адкрыта і разведана Акцябрскае радовішча калійных солей; разведаны і падрыхтаваны да прамысловага асваення буйнейшае ў Еўропе Камунарскае радовішча цэментнай сыравіны, радовішчы гранітаў (Мікашэвіцкае, Сітніцкае і Глушкавіцкае), даламітаў (Гралёва), абліцовачнага каменя (Кар’ер Надзеі), бурых вуглёў (Жыткавіцкае і Брынёўскае), шкляных пяскоў (Гараднoe), фармовачных глін (Астражанскае), мелу і сілікатных пяскоў (Хацісла ўскае), трэпелаў (Стальное), прамысловых расолаў (Барысаўскае), шматлікія радовішчы прэсных і мінеральных падземных вод; выканана папярэдняя разведка Брынёўскага радовішча гіпсу, Тураўскага і Любанскага – гаручых сланцаў, Арэхаўскага і Прыгранічнага – фасфарытаў, Дзедаўка і Сітніца – каалінаў і інш.

П.З. Хоміч з’яўляўся паслядоўным прыхільнікам пошукаў у нашай краіне новых відаў карысных выкапняў, увядзення у распрацоўку разведаных радовішчаў. Пад яго кіраўніцтвам былі адкрыты трубкі выбуху ў Гомельскай вобласці, дадзена ацэнка прамысловай значнасці Аколаўскага і Навасёлкаўскага радовішчаў жалезных руд.

Пётр Захаравіч з’яўляўся адным з асноўных распрацоўшчыкаў некалькіх галіновых і дзяржаўных праграм геолагаразведачных работ па развіцці мінеральна-сыравіннай базы Беларусі, па якіх ажыццяўляліся планаванне, фінансаванне і выкананне пошукаў і разведкі карысных выкапняў і суправаджальных навуковых даследаванняў у краіне. Ён быў намеснікам старшыні Навукова-тэхнічнага савета РУП «Белгеалогія», намеснікам старшыні Рэспубліканскай камісіі па запасах карысных выкапняў, галоўным рэдактарам і арганізатарам выдання фундаментальнай манаграфіі «Полезные ископаемые Беларуси» (2002).

П.З. Хоміч годна прадстаўляў Беларусь падчас камандзіровак у Расіі, Украіне, Чэхіі, ЗША, Аўстраліі і іншых краінах, дзе яскрава асвятляў дасягненні беларускіх геолагаў.

Урадавыя ўзнагароды сведчаць аб прызнанні заслуг Пятра Захаравіча перад дзяржавай. Ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, Ганаровы разведчык нетраў СССР, Заслужаны геолаг Рэспублікі Беларусь.

П.З. Хоміч адзначаўся высокім прафесіяналізмам, выключнай інтуіцыяй, уважлівымі адносінамі да людзей, прыроднай дабрынёй. Усё гэта дало яму прызнанне, павагу і аўтарытэт сярод калег і знаёмых.

Пётр Захаравіч Хоміч назаўсёды застанецца ў памяці ўсіх тых, хто яго ведаў і працаваў з ім.

*Калегі, сябры*